# СЛАВА І ГОНАР БЕЛАРУСІ

## *Да 520-годдзя з дня нараджэння мысліцеля-асветніка, гуманіста і першадрукара Францыска Скарыны*

**Сярод дзеячаў эпохі Адраджэння і Рэфармацыі на Беларусі, якія пакінулі значны след у айчынным кнігадрукаванні, культуры, літаратуры і адукацыі, асоба Ф. Скарыны займае адно з ганаровых месцаў. Францыск Скарына ўвайшоў у гісторыю Беларусі як першадрукар і вучоны, асветнік і гуманіст, паэт і медык, батанік і астраном. Чалавек выключна шырокай эрудыцыі, сэнс сваёй дзейнасці ён бачыў у служэнні народу. Скарына імкнуўся далучыць сваіх суайчыннікаў да набыткаў агульначалавечай культуры і рабіў гэта праз кнігі.**

З кожным годам, з кожным дзесяцігоддзем мы ўсё больш выразна ўсведамляем веліч здзяйсненняў славутага палачаніна. Сёння можна сказаць, што ўжо грунтоўна вывучаны знойдзеныя ў розныя часы дакументы, звязаныя з жыццём і дзейнасцю першадрукара. Выданні асветніка вывучаны ў многіх аспектах: шмат зроблена для даследавання мовы Францішка Скарыны, мастацкіх вартасцей яго гравюр, заставак, шрыфтоў, асаблівасцей светапогляду ў сувязі з развіццём грамадскай думкі эпохі Рэнесанса. Вывучэнне жыцця і спадчыны гуманіста мае вялікае значэнне ў выхаванні маладога пакалення: у фарміраванні патрыятызму і адданасці Радзіме, любові да роднай мовы, пачуцця гонару за прыналежнасць да беларускага народа. Друкарская і асветніцкая дзейнасць Францыска Скарыны адлюстравана ў бібліяграфічным спісе «Слава і гонар Беларусі» («Новыя кнігі: па старонках беларускага друку», 2010, № 7), прысвечанаму 520-ай гадавіне з дня яго нараджэння. У спісе адлюстраваны дакументы, выдадзеныя ў 1977–2010 гадах. Гэта выданні і творы мысліцеля, артыкулы з рэспубліканскіх часопісаў, даведачных і навуковых выданняў, творы мастацкай літаратуры, прысвечаныя асветніку, імя якога з'яўляецца сімвалам Беларусі. Бібліяграфічны спіс мае вызначаную структуру і забяспечаны разгорнутай даведкай аб жыццёвым і творчым шляху Ф. Скарыны. Прадстаўленая інфармацыя будзе карысна літаратуразнаўцам, выкладчыкам і настаўнікам, студэнтам і навучэнцам, а таксама ўсім, хто цікавіцца гісторыяй айчыннага кнігадрукавання, культуры і літаратуры. Пазнаёміцца з прапанаваным спісам можна ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ці ў бібліятэцы вашага населенага пункта.

***Т. В. Наварыч,***
*бібліёграф*
*1-ай катэгорыі*
*Нацыянальнай*
*бібліятэкі Беларусі*

